УДК 633.358 : 631.82

Н. П. ЛУКАШЭВІЧ

РЭАКЦЫЯ САРТОЎ ГАРОХУ НА ЎНЯСЕННЕ МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ

Як аб'ект тэхналогіі вырошчвання гарох з'яўляецца недасканалай раслінай. Сцябло яго ў верхняй частцы расліны ў 2—3 разы таўсцейшае, чым у ніжняй, што прыводзіць да палягання. Працягласць і нераўнамернасць паспявання струкоў у межах адной расліны павялічваюць страты зерня пры ўборцы. Таму пры падборы сартоў гароху разам з высокай прадукцыйнасцю трэба ўлічваць і яго тэхналагічнасць.

Прадукцыйнасць і тэхналагічнасць пасеваў гароху ў вялікай ступені залежаць ад узроўню мінеральнага жыўлення. На адчувальнасць гароху пры ўнясенні мінеральных угнаенняў уплывае шмат фактараў, сярод якіх важнейшы — біялагічныя асаблівасці сорту. Роля генатыпу ў жыўленні раслін у навуцы ўвогуле распрацавана недастаткова. Прымяняльна да гароху гэта пазіцыя застаецца зусім нявывучанай, хоць у апошнія гады генафонд культуры абагаціўся за кошт стварэння сартоў, якія рэзка адрозніваюцца па біялагічных і марфалагічных пара-

метрах. Так, створаны сарты з укарочанымі міжвузеллямі, са зменена геаметрыяй ліста, формы з рэдуцыраванымі ліставымі пласцінкамі і прылісткамі і інш. Яны характарызуюцца рознай дынамікай ужывання пажыўных рэчываў і перамяшчэннем іх у раслінныя органы, неаднолькавыя паміж сабой па ступені вынасу макра- і мікраэлементаў і фіксацыі азоту з паветра, таму патрабуюць рознага ўзроўню мінеральнага жыўлення, вызначэнне якога можна прымяніць да канкрэтных глебава-кліматычных умоў. У гэтым — актуальная задача навуковых даследаванняў.

У нашых даследаваннях ставілася мэта выявіць аптымальныя дозы мінеральных угнаенняў і мэтазгоднасць выкарыстання рызатарфіну пры вырошчванні сартоў гароху, якія адрозніваюцца паміж сабой па марфатыпу раслін.

Доследы праводзіліся на эксперыментальнай базе «Зазер'е» Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці на працягу 1987—1989 гг. Глеба доследнага ўчастка дзярнова-падзолістая лёгкасуглінкавая, якая з глыбіні 1 м падсцілаецца марэнавым супескам. Агрохімічная характарыстыка глебавага слоя характарызавалася наступнымі паказчыкамі: pH_{KCl} 6—6,3, колькасць рухомага фосфару — 17—18 і абменнага калію — 25—30 мг/100 г глебы. Папярэднік — збожжавая культура. Уліковая плошча дзялянкі 25 м^2. Доследы праведзены ў адпаведнасці з прынятымі методыкамі. Ураджайныя даныя матэматычна апрацаваны па схеме дысперсійнага аналізу.

У доследзе высяваліся наступныя сарты: Тружанік — лісцікавы, высакарослы, сярэдняспелы, белакветкавы, з неасыпальнасцю насення, раяніраваны ў рэспубліцы; Вегетатыўны жоўты — лісцікавы, высакарослы, познаспелы, з афарбаванымі кветкамі, раяніраваны ў рэспубліцы; Гомік — лісцікавы, кароткасцябловы, познаспелы, з афарбаванымі кветкамі, раяніраваны ў ПНР; Міка — паўбязлісцікавы, сярэднярослы, познаспелы, белакветкавы, раяніраваны ў ПНР, Францыі; Рамір —

Табліца 1. **Ураджайнасць сартоў гароху ў залежнасці ад доз угнаенняў, ц/га**

Сорт	Доза ўгнаенняў, кг/га, д. р.	Ураджайнасць, ц/га			
		1987 г.	1988 г.	1989 г.	сярэдняе
Тружанік	$P_{60}K_{90}$	23,5	26	34,9	28,1
	$P_{60}K_{90}$ + рызатарфін	30,7	29,7	42,9	34,4
	$N_{30}P_{60}K_{90}$	31,1	28,7	39,5	33,1
	$N_{60}P_{60}K_{90}$	31,2	31,3	42,5	35
	$N_{90}P_{60}K_{90}$	31,5	31	42,6	35
Вегетатыўны жоўты	$P_{60}K_{90}$	34,8	29,9	24,9	29,9
	$P_{60}K_{90}$ + рызатарфін	37,2	32,1	31,2	33,5
	$N_{30}P_{60}K_{90}$	38,6	31,2	32,2	34
	$N_{60}P_{60}K_{90}$	38,4	33,7	33,6	35,2
	$N_{90}P_{60}K_{90}$	37,2	34,8	34,5	35,5
Міка	$P_{60}K_{90}$	36,6	38,9	33,5	36,3
	$P_{60}K_{90}$ + рызатарфін	38	40,1	35,6	37,9
	$N_{30}P_{60}K_{90}$	39,4	40,1	44,4	41,3
	$N_{60}P_{60}K_{90}$	39,1	39,7	39,2	39,3
	$N_{90}P_{60}K_{90}$	37,6	40,2	39,1	39
Рамір	$P_{60}K_{90}$	24,2	26,4	23,7	24,8
	$P_{60}K_{90}$ + рызатарфін	25,1	25,1	24	24,7
	$N_{30}P_{60}K_{90}$	25,7	27	27	26,6
	$N_{60}P_{60}K_{90}$	25,6	28,1	27,1	26,9
	$N_{90}P_{60}K_{90}$	27	29,2	28,9	28,4
Гомік	$P_{60}K_{90}$	28,1	29,1	33,9	30,4
	$P_{60}K_{90}$ + рызатарфін	29,5	33,3	39,2	34
	$N_{30}P_{60}K_{90}$	32,8	35	36,7	34,8
	$N_{60}P_{60}K_{90}$	31,5	34,4	39,2	35
	$N_{90}P_{60}K_{90}$	29	34,2	39,6	34,3
$НІР_{05}$		3,2	3,4	2,5	